# ВОДЗЫЎ

аб аўтарэфераце дысертацыі
Жука Васілія Ігаравіча
"Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў:
на матэрыяле другасных намінацый",
прадстаўленай на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае
і супастаўляльнае мовазнаўства

Дысертацыйнае даследаванне В.І. Жука прадстаўляе інтарэс не толькі для супастаўляльнага мовазнаўства, нават і для лінгвістычнай навукі ўвогуле, – гэта сапраўды разгорнутае, цэласнае, навукова абгрунтаванае паведамленне аб адным з найбольш важных фрагментаў фундаментальнага светаўспрымання для любога чалавека, і ў прыватнасці, для прадстаўнікоў беларускамоўнай і англамоўнай лінгвакультур.

Як сведчыць аўтарэферат дысертацыі, у ёй вырашаецца мэта ўстанаўлення спецыфікі рэпрэзентацыі другасных альфакторных намінацый сродкамі беларускай і англійскай моў.

Атрыманыя вынікі характарызуюцца безумоўнай навізной: комплексны аналіз другасных альфакторных намінацый беларускай і англійскай моў праведзены ўпершыню. Дысертантам устаноўлены семантычныя мадэлі (прамыя і абарачальныя) утварэння другасных альфакторных ЛСВ у трох лексіка-граматычных разрадах слоў (ад'ектывах, субстантывах і дзеясловах); выяўлены спецыфічныя для кожнай мовы тыпалагічныя мадэлі семантычнай дэрывацыі, якія ў працэсе параўнання выявілі карэлятыўныя пары альфакторных намінацый з адносінамі семантычнага супадзення, частковай эквівалентнасці і безэквівалентнасці. Асаблівай увагі заслугоўвае падрыхтаваны даследчыкам беларуска-англійскі тлумачальны слоўнік другасных альфакторных намінацый.

У выніку азнаямлення з аўтарэфератам (дарэчы, з вялікай для нас цікавасцю) мы ўсёж хацелі б задаць адно пытанне, зрабіць адну заўвагу і выказаць адно пажаданне аўтару.

Пытанне. Якім чынам уплывае менавіта фактар рознаструктурнасці супастаўленых у дысертацыі моў на адзначаныя аўтарам пэўныя несупадзенні, выяўленыя ў працэсе супастаўляльнага аналіза фактаў адной і другой моў? Гл., у прыватнасці, такія сцвярджэнні: "Вялікая колькасць беларускіх дзеясловаў не мае эквівалентных семантычных адзінак у англійскай мове, радзей сустракаюцца выпадкі адсутнасці беларускіх эквівалентаў для англійскіх слоў" (с. 4); "Міжмоўныя адрозненні ў рэпрэзентацыі альфакторных паняццяў выражаюцца перш за ўсё ў рознай прадстаўленасці донарскіх сфер, уключаных у працэс семантычнай дэрывацыі, колькасным складзе другасных ЛСВ, наяўнасці ці адсутнасці меліяратыўных і пеяратыўных ЛСВ, што абумоўлена адрозненнямі нацыянальна-гістарычных, культурных і рэлігійных уяўленняў 17

носьбітаў розных моў, асаблівасцямі іх менталітэту, а таксама спецыфікай лексічнай і граматычнай сістэм беларускай і англійскай моў” (с. 16-17).

Заўвага. На жаль, з аўтарэферата ніяк не вынікае сфера прымянення статыстычнага метаду, які заяўлены ў спісе выкарыстаных метадаў даследавання (ёсць толькі асобныя колькасныя падлікі).

Пажаданне. Хацелася б убачыць у далейшых работах даследчыка ўзмацненне этна- і лінгвакультурнага аспектаў, заязаных з аналізуемым матэрыялам, якія толькі пункцірна абазначаны ў аўтарэфераце (але, магчыма, больш поўна прадстаўлены ў самой дысертацыі?).

Тым не менш адзначаныя крытычныя моманты маюць выключна прыватны характар і выказаны ў парадку дыскусіі. Вынікі даследавання, якое ажыццявіў Васілій Ігаравіч Жук, яшчэ раз падкрэслім, грунтоўныя, самадастатковыя, запатрабаваныя часам. Яны зацікавяць не толькі лінгвістаў-лексіколагаў, але і шэраг спецыялістаў іншых моваведчых дысцыплін і нават прадстаўнікоў іншых навуковых напрамкаў, змогуць знайсці выкарыстанне пры далейшай распрацоўцы праблем лінгвістычнай тыпалогіі, семантыкі, выкладанні курсаў лексікалогіі, семасіялогіі, лексікаграфіі, параўнальнай тыпалогіі беларускай і англійскай моў.

Лічу, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі Палажэння аб прысуджэнні навуковых ступеняў і прысваенні навуковых званняў Жуку Васілію Ігаравічу можа быць прысуджана навуковая ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці “10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства”.

Дацэнт кафедры беларускай
і рускай філалогіі
УА МДПУ імя І.П.Шамякіна,
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт
20.03.2023

С.Б. Кураш

С.Б. Кураш
Ткач
20 03